НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS MANAGEMENT
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS

NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

*Series «History, archeography, source studies»*

# Archivaryus

*Collection of scholarly papers and articles*

*Founded in 2001*

## Volume 10

Minsk
NHAB
2012

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

*Серыя*
*«Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»*

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

*Выходзіць з 2001 года*

## Выпуск 10

Мінск
НГАБ
2012

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны дзясяты выпуск штогодніка «Архіварыус». На яго старонках асвятляецца шырокае кола пытанняў па гісторыі, архівазнаўстве, археаграфіі, крыніцазнаўстве і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплінах. Публікуюцца дакументы па сярэдневяковай, новай і найноўшай гісторыі Беларусі, агляды архіўных фондаў і біяграмы беларускіх архівістаў. У навуковы ўжытак уводзіцца шэраг новых, раней невядомых дакументаў і фактаў.

Прызначаецца архівістам, гісторыкам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

*Серыя заснавана ў 1998 г.*

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Укладальнік:
*З. Л. Яцкевіч*

Рэдакцыйная калегія:
*У. І. Адамушка, Ю. М. Бохан* (галоўны рэдактар), *Г. Я. Галенчанка, У. М. Дзянісаў, М. М. Забаўскі, А. М. Люты, А. Я. Рыбакоў, І. В. Саверчанка, М. Ф. Шумейка, З. В. Шыбека, З. Л. Яцкевіч* (адказны рэдактар), *Д. У. Яцэвіч*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук *А. І. Мальдзіс,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам Старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках.

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2012

# Рэзюмэ

**Аўчыннікава Раіса Іллінічна,** старшыня секцыі па тапаніміцы ГА «Беларускае геаграфічнае таварыства».

*«Аналіз кліматычных асаблівасцей на беларускіх землях у перыяд з 1810 па 1813 г.».*

У працэсе вывучэння разнастайных крыніц, у т.л. НГАБ, прааналізаваны асаблівасці клімата ў Беларусі ў адзначаны перыяд. Умовы надвор'я вызначаны як фактар, які паўплываў на вынік вайны 1812 г. У дадатку прыводзяцца статыстычныя звесткі аб кліматычных змяненнях у Віцебску, Варшаве, Вільні, Маскве, Парыжы, Мінску ў першай палове XIX ст., а таксама кліматычныя назіранні ў Барысаўскім павеце ў 1812 г. і Віцебскай губерні ў 1813 г.

**Баравы Расціслаў Вітальевіч,** гісторык архітэктуры, загадчык аддзела гістарычных даследаванняў ТАА «Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый».

*«Планаванне і забудова левабярэжнай часткі гістарычнага цэнтра Мінска ў XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах архіўных крыніц)».*

На падставе дакументаў НГАБ і Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва (РДВГА) у мэтах рэгенерацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны Мінска праведзена даследаванне асаблівасцей планавання і забудовы ў XIX – пачатку XX ст. двух захаваных і трох страчаных кварталаў гістарычнага цэнтра сталіцы, якія змяшчаліся паміж вуліцай Янкі Купалы і левым берагам Свіслачы. Асаблівая ўвага нададзена Траецкаму прадмесцю.

**Галубовіч Віталь Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры грамадскіх навук Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

*«Да гісторыі міжэтнічных дачыненняў у Полацку ў першай палове XVII ст.: выпадак з яўрэямі».*

Даследаваны ўзаемаадносіны полацкіх мяшчан-хрысціян і яўрэяў у першай палове XVII ст. На прыкладзе выпадку супраціўлення палачан яўрэйскаму

засяленню горада ў 1633 г. адзначаны факт прысутнасці ў свядомасці хрысціянскага насельніцтва Полацка тых жа ўяўленняў і стэрэатыпаў у адносінах да яўрэяў, што і ў Заходняй Еўропе.

**Грыб Антон Валер'евіч,** аспірант кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Дзісненскі магістрат: структура і функцыі (паводле актавых кніг перыяду Рэчы Паспалітай)».*

На падставе дакументаў, створаных у Дзісненскім магістраце ў канцы XVII – канцы XVIII ст., а таксама іншых крыніц і літаратуры, аўтар паспрабаваў вызначыць функцыі магістрацкіх пасад з мэтай даследавання іх ролі ў кіраванні г. Дзісна ў перыяд Рэчы Паспалітай.

**Грывянёў Аляксандр Леанідавіч,** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм НГАБ.

*«Полацкі касцёл Святога Ружанца і яго парафія ў другой палове XVIII – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ)».*

З мэтай больш шырокага асвятлення дзейнасці каталіцкай царквы на беларускіх землях па дакументах НГАБ праведзена даследаванне малавядомых старонак гісторыі касцёла Святога Ружанца, іншых касцёлаў і капліц Полацкай парафіі. Прыведзены пералік населеных пунктаў, якія ўваходзілі ў яе склад у 1911 г.

**Доўнар Аляксандр Барысавіч,** загадчык сектара крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*Інфармацыя: Білоус, Н. Тестаменти киян середини XVI – першої половини XVII ст. — К.: Вид. дім «Простір», 2011. — 200 с.*

Даецца навуковая ацэнка працы ўкраінскай даследчыцы Н. Белавус, прысвечанай публікацыі і крыніцазнаўчаму аналізу 13 тэстаментаў кіяўлян сярэдзіны XVI – першай паловы XVII ст., адзначаецца высокі ўзровень навукова-даведачнага апарату і іншыя станоўчыя бакі выдання.

**Жумар Сяргей Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

*«Слова пра Аляксандра Мікалаевіча Міхальчанку».*

Артыкул прысвечаны памяці першага старшыні Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству А. М. Міхальчанкі (19.08.1947–12.02.2012).

**Каралёў Павел Анатольевіч,** старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

*«Захаванне помнікаў архітэктуры Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (па матэрыялах НГАБ)».*

Разгледжаны комплекс мерапрыемстваў, якія ажыццяўляліся расійскім урадам па захаванні помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку аб'ектаў архітэктуры, на беларускіх землях. На падставе дакументальных матэрыялаў НГАБ даследаваны першыя ўказы па ахове помнікаў за 1826 і 1837 гг., апісальныя звесткі па розных губернях, цыркуляры і прадпісанні ўлад, парадак дзейнасці статыстычных камітэтаў і вучоных архіўных камісій. Адзначаецца актуальнасць дадзенай тэмы для сённяшняга дня, калі пытанне аховы гісторыка-культурнай спадчыны робіцца адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**ЛАТУШКІН АНДРЭЙ МІКАЛАЕВІЧ,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў (частка V, літары С–Я)».*

Дадзеным артыкулам завяршаецца публікацыя біяграм архівістаў Нясвіжскага архіва XVIII–XX стст. Прыводзяцца звесткі аб архівістах, чые прозвішчы пачынаюцца з літар С–Я (16 асоб). Для складання біяграм выкарыстаны дакументы НГАБ, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (ДГАЛ, Вільнюс), Галоўнага архіва старажытных актаў (ГАСА, Варшава). Найбольшая ўвага нададзена жыццядзейнасці Рамуальда Сымановіча (1793–1873) і Баляслава Таўрагінскага (1904/1905–1974), адных з найбольш яскравых беларускіх архівістаў свайго часу.

**ЛАШКЕВІЧ АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ,** кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ.

*«Эпізоды дзейнасці Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ)».*

Артыкул падрыхтаваны па не публікаваных раней дакументах НГАБ. У ходзе іх вывучэння даецца характарыстыка працы Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення па захаванні стабільнасці сацыяльна-палітычнага ладу Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на падуладнай яму тэрыторыі. Адзначаны асобныя накірункі працы згаданай установы: нагляд за дзейнасцю легальных і нелегальных грамадска-палітычных арганізацый і рухаў, барацьба з выхадам і распаўсюджаннем нелегальнай літаратуры і ваенным шпіянажам, асвятленне прычын хваляванняў рабочых.

**Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Эвалюцыя вайсковага кіравання ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (1796–1812)».*

Разгледжана эвалюцыя ваеннага ўпраўлення на беларускіх землях у 1796–1812 гг. У працэсе навуковага аналізу прапануецца гіпотэза аб увядзенні вясной 1812 г. ваеннага становішча ў памежных рэгіёнах як выніку агульнага недаверу з боку расійскіх улад да насельніцтва беларускіх губерняў, сімпатыі якіх знаходзіліся на баку Напалеона.

***Сумесна*** *з Яцкевічам З. Л. — «Палітычнае становішча беларускіх зямель напярэдадні вайны 1812 г. і падрыхтоўка іх для верагоднага тэатра ваенных дзеянняў».*

Упершыню публікуюцца 24 дакументы НГАБ, якія сведчаць аб агульнай сістэме ваеннага ўпраўлення, раскрываюць палітычныя настроі сярод насельніцтва беларускіх губерняў, паказваюць асаблівасці барацьбы з напалеонаўскай агентурай і спачуваючымі французскай арміі, інфармуюць аб фартыфікацыйным уладкаванні беларускага тэатра ваенных дзеянняў у 1810–1812 гг. і аб узроўні падрыхтоўкі картаграфічных матэрыялаў заходняга рэгіёна.

**Некрашэвіч Піліп Анатольевіч,** магістрант кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Асаблівасці ўзаемаадносін вайскоўцаў Асобнага Літоўскага корпуса і насельніцтва беларускіх губерняў (1817–1830)».*

На падставе дакументаў двух гістарычных архіваў Беларусі, ЛДГА, а таксама манаграфій, нарысаў і шэрагу іншых крыніц разглядаецца і аналізуецца праблема супярэчлівых узаемаадносін мірнага насельніцтва заходніх беларускіх губерняў (Валынскай, Гродзенскай і Мінскай, а таксама Беластоцкай вобласці) і ваеннаслужачых Асобнага Літоўскага корпуса ў адзначаны перыяд. Зроблена выснова аб прычыне канфлікту паміж грамадзянскім насельніцтвам і вайскоўцамі згаданага баявога падраздзялення.

**Несцяровіч Юрый Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археаграфіі БелНДІДАС.

*«Да пытання аб пабудове тэрмінасістэмы археаграфіі: нарыс па экспілікацыі паняцця стандартнай перадачы тэксту публікуемага гістарычнага дакумента».*

Даследуючы тэрміналагічны апарат дакументалогіі і археаграфіі, аўтар робіць спробу ўключыць у археаграфічную тэрмінасістэму паняцце «стандартная перадача тэксту публікуемага гістарычнага дакумента». Праводзіць аналіз карэктнасці выкарыстання ў археаграфіі тэрмінаў і паняццяў, якія характарызуюць розныя спосабы перадачы тэксту гістарычнага дакумента.

***Яго ж,*** *«Аптымізацыя выкарыстання тэрмінаў «транслітарацыя», «практычная транскрыпцыя», «транскрыбіраванне» ў сферы эдыцыйнай дзейнасці».*

Выкарыстоўваючы паняційны апарат лінгвістыкі, археаграфіі і тэксталогіі, аўтар прапаноўвае сваю трактоўку тэрмінаў «транслітарацыя», «практычная транскрыпцыя», «транскрыбіраванне» ў сферы эдыцыйнай археаграфіі.

***Яго ж,*** *Інфармацыя: Метадычныя рэкамендацыі па публікацыі польскамоўных дакументаў XVI–XIX стст. / склад. А. І. Шаланда. — Мінск: БелНДІДАС, 2012. — 47 с.*

Аналізуецца выданне, якое з'яўляецца складаючай часткай серыі «Метадычныя рэкамендацыі па эдыцыі ў Рэспубліцы Беларусь». Адзначаюцца моцныя бакі працы, звяртаецца ўвага на недакладнасці ў эдыцыйнай тэрміналогіі.

**НІКІЦЕНКА ВОЛЬГА МІХАЙЛАЎНА,** вядучы архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Дакументы з архіваў устаноў Мінскай губерні, складзеныя ў 1873 г. для міжведамаснай камісіі па пытаннях архіўнай справы».*

На падставе звестак архіўных крыніц раскрываюцца адносіны да архіўнай справы дзяржаўных устаноў у канцы XIX ст. Адзначаны аспекты дзейнасці міжведамаснай камісіі М. В. Калачова па пытаннях архіўнай справы (1873–1885 гг.). У шасці публікуемых дакументах, якія змяшчаюць звесткі з гісторыі пяці архіўных устаноў Мінскай губерні, распавядаецца пра парадак, умовы захавання і ўліку дакументальных матэрыялаў, мерапрыемствы па ўдасканаленні архіўнай арганізацыі.

**СЕРАК АЛЕНА УЛАДЗІМІРАЎНА,** старшы выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

*«Матэрыялы аб дзейнасці Ашмянскай следчай камісіі па пакаранні ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг.».*

На падставе архіўных матэрыялаў аўтар аналізуе функцыянаванне Ашмянскай ваенна-следчай камісіі, разглядае яе склад і асноўныя накірункі дзейнасці. Зроблена выснова аб тым, што ключавымі ў працы

камісіі былі пытанні, звязаныя з вызначэннем ступені віны і спосабу пакарання ўдзельнікаў і асоб, якія спачувалі паўстанню 1863–1864 гг., а таксама з размяшчэннем падследчых і рэгламентацыяй парадку іх утрымання.

**Соркіна Іна Валер'еўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

*«Падзеі вайны 1812 г. у лёсе мястэчка Капыль у святле аднаго дакумента».*

На падставе крыніцы з ДГАЛ аналізуюцца наступствы вайны 1812 г. для мястэчка Капыль Слуцкага павета Мінскай губерні. Адзначаны яго чалавечыя і маёмасныя страты, якія адлюстроўваюць агульную тэндэнцыю, характэрную для ўсёй тэрыторыі Беларусі.

**Урублеўскі Вадзім Валер'евіч,** аспірант кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Характарыстыка штодзённага жыцця беларускага сялянства на падставе судовых матэрыялаў установ Рэчы Паспалітай XVIII ст.».*

Праведзена аналітычнае даследаванне сялянскіх скаргаў, данясенняў возных, дэкрэтаў і іншай судовай дакументацыі як крыніц па гісторыі штодзённага жыцця сялянства ў другой палове XVIII ст. У дадатку на мове арыгінала публікуецца ліст віцебскага скарбніка Ю. Пагоскага за 1787 г., які сведчыць аб цікавай з'яве — прысваенні сялянамі шляхецкага паходжання.

***Яго ж,*** *«Перспектывы стварэння навукова-даведачнага апарату да фонду НГАБ "Мінская мяшчанская ўправа"».*

Разгледжаны існуючы навукова-даведачны апарат да фонду НГАБ «Мінская мяшчанская ўправа» і прапанаваны канкрэтныя падыходы па яго ўдасканаленні, якія будуць спрыяць больш плённай працы даследчыкаў з гэтым каштоўным комплексам дакументаў па гісторыі і генеалогіі мінскіх мяшчан у XIX – пачатку XX ст.

***Яго ж,*** *«Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка III, літары К–Н)».*

Дадзеным артыкулам працягваецца публікацыя біяграм службоўцаў канцылярыі Мінскага ДДС, якія, акрамя сваіх непасрэдных справаводных абавязкаў, ажыццяўлялі ўлік і забеспячэнне захаванасці дакументаў. Публікуюцца звесткі аб канцылярыстах, чые прозвішчы пачынаюцца на

літары К — Н (11 асоб). Для складання біяграм выкарыстаны дакументы НГАБ, а менавіта фармулярныя спісы і вывадовыя справы з фонду Мінскага ДДС.

***Яго ж,*** *Інфармацыя: Климов, С. М. Базилиане. — Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2011. — 152 с.: ил.*

Дадзена характарыстыка першаму ў беларускай гістарыяграфіі спецыяльнаму даследаванню, прысвечанаму гісторыі ордэна базыльян у Вялікім Княстве Літоўскім у 70-я гг. XVIII – 30-я гг. XIX ст.

***Сумесна*** *з Яцкевічам З. Л. Інфармацыя: — Кніга магістрата места Полацка 1727 г. / падрыхт. А. М. Латушкін, М. Д. Макараў. — Беласток: Беларускае навуковае таварыства. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2012. — 406 с.*

Дадзена ацэнка першай у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі поўнай публікацыі ўсёй актавай кнігі асобнай дзяржаўнай установы перыяду Рэчы Паспалітай. Адзначаны вартасці і недахопы выдання.

Чарняўскі Фёдар Віктаравіч, гісторык.

*«Стэфан Гладкі — пісар земскі Менскага ваяводства ў 1571–1617 гг.».*

Даследуюцца факты біяграфіі, сямейна-роднасныя сувязі і маёмаснае становішча пісара земскага Менскага ваяводства Стэфана Фёдаравіча Гладкага. На прыкладзе жыццядзейнасці роду Гладкіх асветлены працэсы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай XVI–XVII стст.

**ШАЛАНДА АЛЯКСЕЙ ІВАНАВІЧ,** кандыдат гістарычных навук, загадчык сектара геральдыкі і нумізматыкі аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін і інфармацыйна-аналітычнай работы НАН Беларусі.

*«Радавод і герб Галубцэвічаў з Полацкага ваяводства ВКЛ у XVI ст.».*

Даследаваны генеалогія і герб полацкіх баяр Галубцэвічаў, упершыню апісваецца гербавая пячатка прадстаўніка роду Яцкі Багданавіча, датаваная 1541 г. Адзначана актуальнасць распрацоўкі радаводаў шляхты Полацкага ваяводства.

**ШУМЕЙКА МІХАІЛ ФЁДАРАВІЧ,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Гісторыя Alma mater скрозь прызму апублікаваных крыніц (да выдання зборнікаў дакументаў у серыі «Память и слава»)».*

З’яўляючыся адным са складальнікаў дакументальных зборнікаў, прысвечаных гісторыі БДУ і выдадзеных у межах універсітэцкай серыі «Памяць і слава», аўтар асвятліў пытанні арганізацыі працы над імі, зрабіў спробу вызначыць значэнне зборнікаў дакументаў у айчыннай археаграфіі, адзначыў іх моцныя і слабыя бакі.

**Яцкевіч Зміцер Лявонцьевіч**, загадчык аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

***Сумесна*** *з Лукашэвічам А. М. — «Палітычнае становішча беларускіх зямель напярэдадні вайны 1812 г. і падрыхтоўка іх для верагоднага тэатра ваенных дзеянняў».*

Упершыню публікуюцца 24 дакументы НГАБ, якія сведчаць аб агульнай сістэме ваеннага ўпраўлення, раскрываюць палітычныя настроі сярод насельніцтва беларускіх губерняў, паказваюць асаблівасці барацьбы з напалеонаўскай агентурай і спачуваючымі французскай арміі, інфармуюць аб фартыфікацыйным уладкаванні беларускага тэатра ваенных дзеянняў у 1810–1812 гг. і аб узроўні падрыхтоўкі картаграфічных матэрыялаў заходняга рэгіёна.

# Змест

**Архівазнаўства**

*О. М. Никитенко*

Документы из архивов учреждений Минской губернии, составленные в 1873 г. для межведомственной комиссии по вопросам архивного дела ........................................ 5

**Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў**

*А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич*

Политическое положение белорусских земель накануне войны 1812 г. и подготовка их для вероятного театра военных действий ........................ 22

*Ю. В. Нестерович*

К вопросу о построении терминосистемы археографии: очерк по экспликации понятия стандартной передачи текста публикуемого исторического документа ........................................ 78

*Ю. В. Нестерович*

Оптимизация употребления терминов «транслитерация», «практическая транскрипция», «транскрибирование» в сфере эдиционной деятельности ........................................ 86

*В. В. Урублеўскі*

Характарыстыка штодзённага жыцця беларускага сялянства на падставе судовых матэрыялаў устаноў Рэчы Паспалітай XVIII ст. .......................... 94

**Крыніцазнаўства**

*Р. І. Аўчыннікава*

Аналіз кліматычных асаблівасцей на беларускіх землях у перыяд з 1810 па 1813 г. ........................................ 115

*Р. В. Боровой*

Планирование и застройка левобережной части исторического центра Минска в XIX – начале XX в. (по материалам архивных источников) ....................132

*В. У. Галубовіч*

Да гісторыі міжэтнічных дачыненняў у Полацку ў першай палове XVII ст.: выпадак з яўрэямі ....................147

*А. В. Грыб*

Дзісненскі магістрат: структура і функцыі (паводле актавых кніг перыяду Рэчы Паспалітай) ....................155

*А. Л. Грывянёў*

Полацкі касцёл Святога Ружанца і яго парафія ў другой палове XVIII – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ)....................168

*П. А. Каралёў*

Захаванне помнікаў архітэктуры Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (па матэрыялах НГАБ)....................188

*А. А. Лашкевіч*

Эпізоды дзейнасці Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ)....................199

*А. М. Лукашевич*

Эволюция военного управления в белорусских губерниях Российской империи (1796–1812).................... 210

*П. А. Некрашэвіч*

Асаблівасці ўзаемаадносін вайскоўцаў Асобнага Літоўскага корпуса і насельніцтва беларускіх губерняў (1817–1830)....................226

*Е. В. Серак*

Материалы о деятельности Ошмянской следственной комиссии по наказанию участников восстания 1863–1864 гг. ....................235

*І. В. Соркіна*

Падзеі вайны 1812 г. у лёсе мястэчка Капыль у святле аднаго дакумента....................243

*Ф. В. Чарняўскі*

Стэфан Гладкі — пісар земскі Менскага ваяводства ў 1571–1617 гг.....................247

## Генеалогія і геральдыка

*А. І. Шаланда*

Радавод і герб Галубцэвічаў з Полацкага ваяводства ВКЛ у XVI ст. ........267

## Навукова-даведачны апарат, забеспячэнне захаванасці і ўліку архіўных дакументаў

*В. В. Урублеўскі*

Перспектывы стварэння навукова-даведачнага апарату да фонду НГАБ «Мінская мяшчанская ўправа» ....................................................................273

## Постаці архівістаў

*А. М. Латушкін*

Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў (частка V, літары С–Я) ..........................................................................277

*В. В. Урублеўскі*

Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка III, літары К–Н)............................................................................295

## Хроніка і бібліяграфія

*С. В. Жумарь*

Слово об Александре Николаевиче Михальченко ...................................302

*М. Ф. Шумейко*

История Alma mater через призму опубликованных источников (к изданию сборников документов в серии «Память и слава»)................305

*Білоус, Н.* Тестаменти киян середини XVI – першої половини XVII ст. — К.: Вид. дім «Простір", 2011. — 200 с. *(А. Б. Доўнар)* ..............................310

*Климов, С. М.* Базилиане. — Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2011. — 152 с.: ил. *(В. В. Урублеўскі)* ........................................................311

Кніга магістрата места Полацка 1727 г. / падрыхт. А. М. Латушкін, М. Д. Макараў. — Беласток: Беларускае навуковае таварыства. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2012. — 406 с. *(В. В. Урублеўскі, З. Л. Яцкевіч)* ...............................................................316

«Метадычныя рэкамендацыі па публікацыі польскамоўных дакументаў XVI–XIX стст.» / склад. А. І. Шаланда. — Мінск: БелНДІДАС, 2012. — 47 с. *(Ю. У. Несцяровіч)*...........................................................................321

Рэзюмэ ........ 325
Резюме ........ 333
Summary ........ 341

Правілы для аўтараў «Архіварыуса» ........ 349

Guidelines for authors of «Archivarius» ........ 350

**Архіварыус:** зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 10 / рэд..: Ю. М. Бохан
**А87** [і інш.]. — Мінск : НГАБ, 2012. — 360 с. — (серыя «Гісторыя, архіва-знаўства, крыніцазнаўства»).

**ISSN 2225-4412.**

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны дзясяты выпуск штогодніка «Архіварыус». На яго старонках асвятляецца шырокае кола пытанняў гісторыі, архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплін. У навуковы ўжытак уводзіцца шэраг новых, раней невядомых дакументаў і фактаў.

Прызначаецца гісторыкам, архівістам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

**УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]**
**ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41**